Цікавы прыклад гэтага становіць прамова ксяндза М. Далецкага, пробашча ў Скапішках, сказаная па–беларуску на інгрэсе[2] біскупа Карэвіча ў 1914 гаду. Яна памешчана ў літоўскай кніжцы „Jo malonybė naujas Žemaičių vyskupas *Pranciškus Karevičius*“[3] (Kaunas, 1914). Перадрукоўваем гэту прамову даслоўна:

„У склад нашай дыяцэзіі ўходзіць, апрыч жмудзінаў і літоўцаў[4], значнае чысло і другіх народнасьцяў: палякаў, беларусаў, латышоў і немцаў. Гэткая народная рабізна ў дыяцэзіі ёсьць абразом паўшэхнага[5] каталіцкага касьцёла, каторы абнімаець усе народнасьці на ўсей зямлі.

Беларусаў у Жмудзкай дыяцэзіі ёсьць на 60 тысячаў, а можа і болей; каб гэта было за граніцай — у Францыі ці Італіі, дык напэўне была б цэлая дыяцэзія. Беларусы — народ многа цямнейшы за сваіх суседзяў палякаў, а нават і літоўцаў, і культуральна яны стаяць ніжэй; аднак яны маюць і добрыя староны: дужа крэпка прывязаны да касьцёла, да веры, да духавенства, біскупаў і Сталіцы Апастольскай.

Яны маюць душу і сэрца і адчуваюць долю і нядолю, смутак і радасьць. Сягоньня і яны цешуцца, дачакаўшы сабе новага біскупа, і спадзяваюцца, што ён для ўсіх сваіх авечак, нягледзя на народнасьць, будзець праўдзівым айцом і духоўным кіраўніком.

Ад іменя маіх спаўбратоў беларусаў я ўзнашу тост за здароўе Найдастойнейшага нашага Біскупа і жычу, каб Бог Яго Эксцэленцыю захаваў на доўгія гады для дабра касьцёла і пажытку авечак, павераных яго аўчарні. Няхай жывець наш Пастыр!“

Трэба спадзявацца, што і ў Віленскай дыяцэзіі счэзьне ўціск беларускай мовы ў касьцеле, калі і гэта дыяцэзія дадджэцца свайго біскупа, калі і сюды будзе назначан чалавек, каторы на першым пляне паставіць справы веры, а ня справы польскай нацыянальнай палітыкі.

## Яго Эксцэленцыі Імпэрскаму Канцлеру

Арганізаванае беларускае грамадзянства (Weissruthenentum) лічыць сваім безумоўным абавязкам ад імя дзевяцімільённага народу выказаць Вашай Эксцэленцыі перакананьне, што Беласток (па–польску Białystok), другі па велічыні беларускі горад і найбольшы прамысловы цэнтар вобласьці[1], які зь яго беларускамоўным навакольлем ніколі не належаў уласна Польшчы[2], ніколі не перайдзе ў склад Польскай дзяржавы, бо гэта было б (страшэннай) несправядлівасьцю ў дачыненьні да беларускага народу і ў супярэчнасьці з прынцыпам абароны прыгнечаных народаў Расеі, які Ваша Эксцэленцыя абвясьціла ў Райхстагу.

Беларускае насельніцтва ніколі не было б задаволена польскім панаваньнем, і гэта было б прычынаю ўзьнікненьня працяглых складанасьцяў.

Старшыня Беларускага камітэту[3] *Антон Луцкевіч*

Рэдактар беларускай газэты „Гоман“ *Вацлаў Ластоўскі*

Дырэктар гарадзкой прафэсійнай пажарнай каманды *Дамінік Сямашка*

Прадстаўнікі Беларускай работніцкай групы *Язэп Салавей, Язэп Ліцкевіч, Язэп Туркевіч*

Старшыня Беларускага клюбу *Іван Луцкевіч*

## Воля Краю

За наш Край гэтулькі ўжо людзей бралася гаварыць, дык гэтак розна гаварылі ўсе ад яго ж імі, што, слухаючы здалёк, папраўдзе не распазнаеш, каторы голас належыць да адвечных жыхароў і гаспадароў яго, каторы — да прыблуд і ўсялякіх самазванцаў. І тым